— павялічыць інфармацыю аб каталогах з мэтай павышэння эфектыўнасці іх выкарыстання.

Пры гэтым, на наш погляд, неабходна абавязкова ўсім кіраўнікам (універсітэта і базы практыкі) быць карэктнымі, умець зацікавіць студэнтаў будучай прафесіяй, таму што менавіта падчас практыкі студэнты атрымліваюць сапраўднае ўяўленне аб ёй.

**В.Н.Мароз,**
**мастацкі кіраўнік узорнага вучэбнага тэатра 136-й СШ г.Мінска, выкладчык Беларускага універсітэта культуры**

# ШЛЯХІ ЎДАСКАНАЛЕННЯ ЗМЕСТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ПРАКТЫКІ СТУДЭНТАЎ РЭЖЫСЁРСКІХ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЕЙ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Тэатральнае мастацтва з'яўляецца адным з найбольш прывабных з пункту гледжання педагагічнага ўздзеяння на асобу, асабліва ў перыяд яе станаўлення. Гэтым тлумачыцца пастаянны рост колькасці тэатральных студый, спецыялізаваных класаў і нават школ з тэатральным ухілам. Усё часцей на рознага роду конкурсах і фестывалях тэатральнай творчасці можна пачуць: "Мы не самадзейнасць. Мы — тэатр, дзе іграюць дзеці". Гэта адбываецца таму, што зараз большасцю тэатральных калектываў кіруюць людзі, што маюць спецыяльную мастацкую падрыхтоўку. Аднак творчы ўзровень работы і педагагічнае майстэрства кіраўнікоў дзіцячых і юнацкіх калектываў далёка не заўсёды супадаюць. Часам даводзіцца назіраць цікавыя тэатральныя рашэнні і адсутнасць умення знайсці для іх рэалізацыі адэкватныя педагагічныя сродкі, а таксама магчымасць працаваць з юнымі выканаўцамі адпаведна іх узроставым асаблівасцям.

Актуальнасць набывае праблема педагагічнай падрыхтоўкі выпускнікоў рэжысёрскіх спецыяльнасцей Беларускага універсітэта культуры, таму што большасць з іх пачынае свой працоўны шлях менавіта ў якасці кіраўнікоў дзіцячых і юнацкіх

гурткоў і студый. Некаторыя ўжо зараз накіраваны на работу з дзіцячай і юнацкай аўдыторыяй. Такім чынам, акрамя грунтоўных тэарэтычных ведаў, якія атрымліваюць нашы студэнты на працягу навучання, ім патрэбны спецыфічныя ўменні і навыкі работы з дзецьмі і падлеткамі.

На вырашэнне азначаных праблем і накіраваны этапы педагагічнай практыкі. Аднак да апошняга часу тая практыка, што адбывалася у 136-й мінскай школе з тэатральным ухілам, не стварала ўражання дастаткова прадуктыўнай. Назіранні за педагагічным працэсам без грунтоўнага аналізу таго, што адбываецца ў тэатральным класе, не прыносілі ні разумення, ні тым больш патрэбных студэнту навыкаў.

Новыя падыходы да педагагічнай падрыхтоўкі студэнтаў Беларускага універсітэта культуры і да месца педага-гічнай практыкі ў гэтай падрыхтоўцы даюць падставы для распрацоўкі сістэмы патрабаванняў да педагагічнай практыкі студэнтаў рэжысёрскіх спецыяльнасцей.

Мы прапануем наступны змест педагагічнай практыкі студэнтаў азначаных спецыялізацый.

Першы этап — азнаямленчая практыка (II курс).

Студэнты прысутнічаюць на занятках па спецыяльных дысцыплінах у спецыялізаваных тэатральных класах ці школах, вядуць дзённікі назіранняў, аналізуюць змест і методыку заняткаў у суадносінах з узростам навучэнцаў. У выніку гэтага этапу практыкі студэнт прадстаўляе:

— справаздачу з аналізам зместу і метадаў работы навучальнай установы;

— характарыстыку аднаго з вучняў з аналізам яго псіхалагічных, асобасных якасцей.

Другі этап — педагагічная практыка (IV курс).

Студэнты рыхтуюць і ажыццяўляюць на практыцы некалькі вучэбных заняткаў па спецыяльных прадметах (майстэрства акцёра, асновы сцэнічнай мовы, асновы сцэнічнага руху).

У выніку гэтага этапу практыкі студэнт прадстаўляе:

— канспект заняткаў з аналізам вынікаў іх правядзення;

— псіхолага-педагагічную характарыстыку навучальнай групы;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

— справаздачу аб правядзенні пазакласнага мерапрыемства.

Трэці этап — творчая практыка (V курс).

На гэтым этапе студэнты далучаюцца да працэсу пастаноўкі вучэбнага спектакля: яны дапамагаюць рэжысёру-пастаноўшчыку ў якасці рэжысёра-педагога.

У выніку гэтага этапу практыкі студэнт прадстаўляе:

— сцэну са спектакля, падрыхтаваную юнымі выканаўцамі пад кіраўніцтвам рэжысёра-пастаноўшчыка;

— творчую характарыстыку выканаўцаў з ацэнкай іх прафесійных перспектыў.

Такім чынам, педагагічная практыка студэнтаў рэжысёрскіх спецыяльнасцей можа і павінна стаць выніковым этапам прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў. Нават калі ў працэсе педпрактыкі стане ясна, што ў студэнта адсутнічаюць здольнасці, якія патрэбны пры рабоце з дзецьмі, гэта таксама карысны вынік.

Прафесійная праца ў галіне тэатральнай творчасці дзяцей і моладзі паспрыяе ўвогуле творчаму росту акцёрскіх і рэжысёрскіх кадраў у нашай краіне.

**Р.С.Матульскі,**
**дацэнт Беларускага універсітэта культуры**

## РЭАЛІЗАЦЫЯ АСНОЎНЫХ ПАЛАЖЭННЯЎ ДЗЯРЖАЎНАГА СТАНДАРТА ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА І БІБЛІЯГРАФІЯ" НА ПРАКТЫЦЫ

Дзяржаўны адукацыйны стандарт па спецыяльнасці "бібліятэказнаўства і бібліяграфія" прадугледжвае праходжанне студэнтамі за перыяд навучання ў ВНУ азнаямленчай (вучэбнай), вытворчай (тэхналагічнай) і пераддыпломнай практыкі. Падчас практыкі студэнт павінен пазнаёміцца з рознымі накірункамі дзейнасці бібліятэк, замацаваць атрыманыя тэарэтычныя веды, набыць практычныя навыкі і ўменні, неаб-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ